# XXIV КАНФЕРЭНЦЫЯ ЛІТУАНІСТЫЧНАЙ КАМІСІІ ПРЫ КАМІТЭЦЕ ГІСТАРЫЧНЫХ НАВУК ПАН «ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ЛІТОЎСКАЕ XV—XVIII стст.: ПРАБЛЕМЫ ГІСТАРЫЯГРАФІІ — КУЛЬТУРНЫЯ ТРАНСЛЯЦЫІ» (Варшава, 22—23 верасня 2015 г.)

У 1992 г. пры Камітэце гістарычнах навук Польскай акадэміі навук паўстала Літуаністычная камісія. Галоўнай мэтай гэтага аб'яднання быў названы абмен апошнімі дасягненнямі нацыянальных гістарыяграфій і прэзентацыя найноўшых навуковых прац. У верасні 2015 г. у Інстытуце гісторыі Польскай акадэміі навук адбылася чарговая, XXIV канферэнцыя Літуаністычнай камісіі.

Гэтым разам сустрэча была прысвечана разгляду і аналізу нацыянальных гістарыяграфій і выяўленню культурнага ўзаемаўплыву народаў, якія пражывалі на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага. Арганізатарамі канферэнцыі выступілі Інстытут гісторыі ПАН, Гістарычны інстытут і Інстытут гісторыі права Варшаўскага ўніверсітэта.

Работа вялася ў двух напрамках: «Праблемы гістарыяграфіі Вялікага Княства Літоўскага: поспехі, паразы, перспектывы» і «Культурныя трансляцыі». У першай частцы канферэнцыі выступоўцы пазнаёмілі прысутных з асаблівасцямі развіцця сучасных літоўскай, беларускай, украінскай, расійскай і нямецкай гістарыяграфій. Даследчыкі засяродзілі ўвагу як на адлюстраванні тэндэнцый у развіцці нацыянальнай гістарыяграфіі на працягу XX — пачатку XXI ст. (Н. Старчанка з Украіны, Л. Козік з Беларусі), так і на яе становішчы ў апошнія 20—25 гадоў (З. Кяўпэ з Літвы, М. Нэндорф з Германіі, І. Герасімава з Расіі). Літоўская даследчыца Ю. Кяўпене ахарактарызавала вобраз Вялікага Княства Літоўскага, які вынікае з сучаснай шматтомнай абагульняючай працы «Гісторыя Літвы».

Абмеркаванне дакладаў вылілася ў бурлівую дыскусію, падчас якой уздымаліся пытанні перыядызацыі гісторыі ВКЛ, самога паняцця «нацыянальная гістарыяграфія» на сучасным этапе развіцця гістарычнай навукі. Даследчыкі звярнулі ўвагу на той факт, што ва ўмовах акадэмічнай і навуковай мабільнасці паняцці «польская, беларуская, украінская, расійская гістарыяграфія» з'яўляюцца ў значнай ступені анахранізмам.

Падчас абмеркавання праблем культурнага ўзаемаўплыву народаў ВКЛ увазе прысутных былі прадстаўлены даклады аб паўсядзённым жыцці віленскіх канонікаў у XVI ст. (В. Паўлікоўская-Баттэрвік), узаемадачыненнях праваслаўных, пратэстантаў і яўрэяў у шматканфесійных гарадах ВКЛ на прыкладзе Слуцка (М. Цесля), паўсядзённым жыцці камедулаў у Пажайслiскім манастыры ў апісанні французскіх і прускіх падарожнікаў XVIII — пачатку XIX ст. (М. Пакныс). Незвычайны погляд на двухмоўных (польска-літоўскіх) паэтаў пачатку XIX ст. на тэрыторыі былога ВКЛ прадставіў гісторык літаратуры П. Буковец. Ён паставіў пад сумненне не толькі этнічную прыналежнасць літоўскіх культурных дзеячаў XIX ст., але і само пытанне аб неабходнасці іх этнічнай ідэнтыфікацыі.

Заканчэнне работы канферэнцыі было адзначана працяглай дыскусіяй, якая сведчыла аб розных падыходах даследчыкаў да разгляданых праблем і адначасовым жаданні прыйсці да ўзаемапаразумення. Найбольш востра паўстала пытанне аб выкарыстанні паняццяў «нацыя» і «нацыянальны» пры апісанні гісторыі Сярэднявечча і Ранняга новага часу. Змест дыскусіі быў не менш цікавым, чым паведамленні выступоўцаў. Арганізатары мерапрыемства зазначылі, што на наступны год плануецца правядзенне чарговай навуковай сустрэчы, праблемным полем якой стане разгляд гісторыі пагранічча.

**Л. А. Козік**, дацэнт кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян БДУ